В течение 1991 — начале 1992 г. независимость Беларуси была полностью де-юре признана международным сообществом. В число первых государств, которые признали Беларусь еще до отставки М. Горбачева и подписания Алмаатинской декларации, вошли Турция (16 декабря 1991 г.), Швеция (19 декабря 1991 г.), Монголия (20 декабря 1991 г.). 27 декабря 1991 г. суверенитет Беларуси был признан США. До конца года Беларусь признают 54 государства мира, 2 из которых установили с Беларусью дипломатические отношения (США и Украина).

Признание протекало по нарастающей и интенсифицировалось в 1992 г. Международно-правовое признание сопредельными странами являлось первым шагом по формированию пояса добрососедства по периметру собственных границ.

Признание суверенитета Беларуси не всегда шло параллельно с установлением дипломатических отношений. Из 129 государств, признавших Республику Беларусь в период 1991—1994 гг., дипломатические отношения с белорусским государством установило только 102. В основном дипотношения устанавливались путём подписания соответствующего соглашения или протокола в ходе визитов в страну глав зарубежных внешнеполитических ведомств и министра иностранных дел Беларуси за рубеж. С некоторыми государствами дипотношения были установлены через обмен дипломатическими нотами.

Процесс признания независимости Беларуси можно разделить на несколько этапов:

1) вхождение БССР в состав СССР, когда были сохранены частично отдельные вопросы самостоятельности республики;

2) признание за БССР частичной международной правосубъектности (вхождение в состав ООН);

3) политика перестройки и нарастание центробежных тенденций на союзном пространстве, формирование предусловий для выхода Беларуси из состава СССР;

4) объявление Декларации о государственном суверенитете БССР, начало широкой общественно-политической дискуссии по вопросу восстановления белорусской государственности и независимости;

5) перерастание центробежных тенденций на союзном пространстве в необратимый процесс, активизация усилий союзных республик по международному признанию их независимости, документальное оформление дезинтеграции СССР и появления молодых независимых государств, в том числе Республики Беларусь.

**Список цитируемых источников**

1. Дэкларацыя Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. — 1991. — № 31. — С. 5—8.

2. Энциклопедический словарь экономики и права. — М. : Науч. кн., 2005. — 736 с.

3. *Моисеев, А. А.* Суверенитет государства в современном мире: международно-правовые аспекты / А. А. Моисеев. — М. : Науч. кн., 2006. — 246 с.

4. *Камышев, Ю. К.* Международное признание Республики Беларусь / Ю. К. Камышев // Журн. междунар. права и междунар. отношений. — 2005. — № 1. — С. 6—10.

5. *Карбалевич, О.* Политическое развитие и национально-государственные интересы Республики Беларусь (1988—1996 гг.) / О. Карбалевич // Інфарм.-аналіт. бюл. — 1999. — № 1 (6). — С. 24—48.

УДК 930.1

**А. У. Літвінскі**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

## НАЦЫЯНАЛЬНА-ГІСТАРЫЧНАЯ САМАСВЯДОМАСЦЬ ЯК ФАКТАР СТАНАЎЛЕННЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

У артыкуле, які прапануецца зацікаўленаму чытачу, аналізуецца ўплыў нацыянальна-гістарычнай самасвядомасці насельніцтва Беларусі на працэс станаўлення беларускай дзяржаўнасці. Асобныя аспекты гэтай праблемы намі разглядаліся раней [1—3], і матэрыялы папярэдніх работ выкарыстаны ў дадзеным артыкуле, аднак адлюстраваная ў яго назве праблематыка, па вялікім рахунку, даследуецца аўтарам ўпершыню. Зразумела, фармат артыкула дазваляе разгледзець навуковую праблему толькі збольшага, шляхам тэзіснага паказу асноўных тэндэнцый эвалюцыі нацыянальна-гістарычнай самасвядомасці ў кантэксце беларускага дзяржаўнага будаўніцтва. Паколькі падрыхтоўка работы прымеркавана да маючага адбыцца Круглага стала, мы палічылі дапушчальным у пэўнай ступені адыйсці ад стылістыкі акадэмізму і зрабіць ухіл, хаця і не надта значны, у бок эсэістыкі, якая, на наш суб’ектыўны погляд, больш адпавядае фармату Круглага стала з яго паліфанічнасцю і дыскусійнасцю.

Мабыць, варта пачаць з таго, што працэс фарміравання беларускай нацыі быў надзвычай складаным і супярэчлівым. Фактычна адмоўныя і станоўчыя фактары ўраўнаважвалі адзін аднаго. Да першых аднясем непаўнату сацыяльнай структуры беларускага этнасу па стане на пачатак і нават на сярэдзіну XIX ст., яго «плебейскі» характар [4, с. 75—76], рэлігійна-канфесійны раскол беларускай

© Літвінскі А. У., 2018

Рэпазіторый БарДУ

этнічнай супольнасці, нізкі ўзровень этнічнай самасвядомасці беларусаў (нават сучасны аўтаэтнонім прыжываўся даволі цяжка, сярод іх успомнім пра вядомы феномен «тутэйшасці»), актыўная палітыка русіфікацыі з боку ўладаў Расійскай імперыі, недастатковы ўзровень развіцця адукацыйнай сістэмы. Да другіх — умацаванне сацыяльна-эканамічных сувязей паміж рэгіёнамі Беларусі, паступовае павышэнне агульнага ўзроўню адукаванасці насельніцтва, развіццё беларусазнаўства, адраджэнне беларускай літаратурнай мовы (што важна адзначыць, на аснове жывой гутарковай мовы, а не на аснове мовы пісьмовых крыніц эпохі ВКЛ) і, адпаведным чынам, пачатак выдання беларускай мастацкай літаратуры і перыядычнага друку (з 17 кастрычніка 1905 г., ад Маніфеста Мікалая II — на легальных падставах), пачатак фарміравання беларускай нацыянальнай эліты, які найбольш адметна выявіўся ў факце ўзнікнення Беларускай сацыялістычнай грамады — першай акрэслена нацыянальнай беларускай палітычнай партыі.

Сярод станоўчых фактараў асобна трэба вылучыць развіццё беларусазнаўства. І тут можна паразважаць пра адзін з парадоксаў беларускай гісторыі. Вядома, што стваральнікі, так бы мовіць, «класічнай» традыцыі беларусістыкі, навуковая дзейнасць якіх прыпадае на другую палову XIX — пачатак XX ст. і амаль сінхранізуецца з найбольш інтэнсіўнай фазай фарміравання беларускай нацыі, зусім не былі беларускімі нацыянальнымі дзеячамі і, за рэдкім выключэннем, з'яўляліся прыхільнікамі ідэалогіі заходнерусізму, хаця з гэтай нагоды наўрад ці будзе карэктным адмаўляць ім у прыхільнасці да беларускасці, хаця гэтая беларускасць мела своеасаблівы «этнаграфічна-краёвы характар», у значнай ступені адрозны ад беларускай нацыянальнай ідэі, і таму, на думку А. І. Цвікевіча, даволі супярэчлівы і непаслядоўны [5, с. 289—294, 322—329] (тут варта назваць такія імёны, як І. І. Насовіч, П. В. Шэйн, Е. Р. Раманаў, М. Я. Нікіфароўскі, У. К. Стукаліч, А. П. Сапуноў, і, зразумела, Я. Ф. Карскі).

Аднак іх працы напоўніцу былі выкарыстаны якраз дзеячамі беларускага нацыянальнага руху ў рэчышчы канструявання нацыянальнай ідэі, паколькі з гэтых прац браліся аргументы на карысць самастойнага існавання беларускага народа як аб'ектыўнай рэальнасці. Складваецца ўражанне, што першапачаткова гэтыя дзеячы не ў дастатковай ступені выкарысталі навукова-гістарычны патэнцыял у працэсе дадзенага канструявання. Гэта можна растлумачыць, па-першае, тым, што не на ўсё ставала часу і сіл. Адносна нешматлікія, да таго ж ва ўмовах і маштабах Расійскай імперыі малаўплывовыя, яны вымушаны былі перш за ўсё сцвердзіць існаванне беларусаў у якасці этнічнай супольнасці «тут і зараз», і сацыяльна-палітычная актуальнасць для іх была важнейшай за гістарычную рэтраспекцыю.

Па-другое, гіпертрафаваная сацыяльнасць іх дзейнасці прадугледжвала зварот да звычайнага беларускага мужыка як да магчымай апоры беларускага руху. Можна пагадзіцца з думкай А. І. Цвікевіча, калі ён зазначаў, што рэчаіснасць Расійскай імперыі ў канцы XIX — пачатку XX ст. літаральна прымушала людзей, якія фарміравалі і адстойвалі беларускую нацыянальную ідэю, шукаць падтрымкі ў бядняцка-серадняцкіх колах тутэйшага сялянства, паколькі нават больш заможнае сялянства прыязна паглядала ў бок заходнерусізму, чакаючы даброт ад царскага ўраду [5, с. 313—314] (пра апошняе, як вядома, яскрава сведчылі вынікі выбараў у дзяржаўныя думы па беларускіх губернях). Наогул, як лічыць В. В. Акудовіч, «ніводнага з базавых складнікаў (шматлікі сярэдні клас, капіталізацыя і ўрбанізацыя), неабходных для паўставання Нацыі, Беларусь ні ў XIX, ні на пачатку XX стагоддзя не мела» [6, с. 40]. Таму нараканні на тое, што беларускі рух быў занадта сацыялістычным і не змог плённа выкарыстаць патэнцыял больш заможных пластоў грамадства, якія раз-пораз выказваюцца ў дыскусіі па праблемах беларускага нацыянальнага будаўніцтва, на нашу думку, не маюць належных падстаў (хаця аўтар гэтых радкоў калісьці прытрымліваўся падобнай пазіцыі). Паколькі нацыянальная агітацыя адрасавалася гарапашнаму сялянству, даводзілася ўлічваць вельмі нізкі ўзровень гістарычных ведаў гэтай сацыяльнай групы, амаль абсалютную незапатрабаванасць ёю навукова-гістарычнага дыскурсу, нават пэўны антыгістарызм яе ментальнасці, і дадзеная акалічнасць не рабіла надзённай справу распрацоўкі ўласна беларускай канцэпцыі гісторыі Бацькаўшчыны.

Да таго ж вядомы футурызм сацыялістычнай ідэалогіі, яе скіраванасць у будучыню, нават часам з эсхаталагічным адценнем — не самае лепшае жыўленне гістарычнай свядомасці і самасвядомасці. Такі падыход арыентаваў на тое, што мінулае, якое ацэньвалася гіперкрытычна (разам з сучаснасцю), мае каштоўнасць непараўнальна меншую, чым меркаваная амаль што ідэальная будучыня.

Была яшчэ і ўласна гістарыяграфічная прычына, што стрымлівала развіццё беларускай нацыянальна-гістарычнай самасвядомасці. Прычына гэтая выглядала як быццам нейкае зачараванае кола: відавочны брак навукова-гістарычнай кваліфікацыі беларускіх адраджэнцаў перашкаджаў ім стварыць нацыянальную канцэпцыю мінуўшчыны і нацыянальную навукова-гістарычную школу, а без існавання і таго, і другога немагчыма было павысіць адпаведную кваліфікацыю да хаця б адносна высокага ўзроўню. У сваю чаргу, без асэнсавання гістарычнага мінулага роднага краю падмурак адраджэння стаўся б вельмі хісткім.

У такіх умовах дзеячам беларускага нацыянальнага руху не заставалася іншага выйсця, як спачатку спрабаваць адаптаваць існуючыя канцэпцыі для патрэбаў гэтага самага руху. Не сказаць, каб па стане на пачатак XX ст. поле беларускай мінуўшчыны не было кранутае плугам навукова-гістарычных даследаванняў. Асабліва актыўна, пачынаючы з 60-х гг. XX ст., шчыравалі на ім прадстаўнікі ўжо згаданага вышэй заходнерусізму [7, с. 173—206]. Тэзіс аб беларусах як аб частцы адзінага рускага народа, грунтаваўся ў заходнерусістаў на прызнанні праваслаўя ў якасці духоўнай асновы ўсходнеславянскага адзінства. Зразумела, што ўсё каталіцкае і польскае ацэньвалася пры такім падыходзе адмоўна. Не ў апошнюю чаргу гэта тлумачыцца тым, што заходнерусізм узнік як ідэалогія своеасаблівага



Рэпазіторый БарДУ

сацыяльнага і канфесійнага рэваншу. Шмат хто з актыўных заходнерусістаў першага пакалення паходзіў з уніяцкага асяроддзя. Яны добра ведалі аб «плебейскім», у пэўнай ступені, прыніжаным статусе грэка-каталіцкай царквы ў параўнанні з рымска-каталіцкай, статусе, які трывала захоўваўся амаль на працягу ўсяго існавання Рэчы Паспалітай.

Праўда, меркаванні дваранскай салідарнасці для царызму доўгі час былі важнейшымі за вернападданніцтва разначынцаў-«западноруссов», паколькі польскае памешчыцкае землеўладанне істотна не абмяжоўвалася, а пасады займалі дваране, якія з’яўляліся ўраджэнцамі ўнутраных губерняў Расіі [5, с. 278—284]. І толькі ў перыяд актыўнай палітычнай дзейнасці П. А. Сталыпіна — рашучага прыхільніка русіфікацыі Беларусі — кіруючыя колы імперыі павярнуліся тварам да ідэйных нашчадкаў безумоўнага лідара заходнерусісцкай навукова-гістарычнай школы М. В. Каяловіча [5, с. 299—310].

У пачатку ХХ ст. заходнерусізм, як з’ява гістарычнай навукі, пастунова, нягледзячы на падтрымку з боку ўрада імператарскай Расіі, стаў здаваць свае пазіцыі ў параўнанні з расійскай гістарыяграфіяй ліберальнага кірунку. Аднак у якасці фактара гістарычнай самасвядомасці і этнакультурнай самаідэнтыфікацыі беларусаў дадзеная плынь грамадска-палітычнай і навукова-гістарычнай думкі аказала відавочны ўплыў на далейшае гістарычнае развіццё Беларусі. Можна пагадзіцца са сцвярджэннем польскіх гісторыкаў беларускага этнічнага паходжання А. Латышонка і Я. Мірановіча пра тое, што на працягу XIX—XX стст. адбылася цывілізацыйная пераарыентацыя Беларусі з Польшчы на Расію [8, с. 14—15]. Безумоўна, заходнерусізм як ідэалогія, увасобленая ў гістарычных працах, спрычыніўся да гэтага працэсу.

На думку І. А. Марзалюка, заходнерусізм, больш у якасці навукова-гістарычнай школы, чым палітычнай ідэалогіі, істотным чынам паўплываў на стварэнне своеасаблівай беларускай гістарыяграфічнай, а ў пэўным сэнсе, і культурна-аксіялагічнай «матрыцы» [4, с. 16—37, 82], паколькі, хаця «адны заходнерусы цалкам адмаўлялі якую б там ні было беларускую самабытнасць, другія ж горача да яе апелявалі, публікуючы крыніцы па беларускай гісторыі, збіраючы беларускі фальклор, вывучаючы і духоўную, і матэрыяльную культуру беларускага народа» [4, с. 37]. У чымсьці падобную ацэнку дзейнасці М. В. Каяловіча і яго паслядоўнікаў мы можам знайсці ў А. Латышонка, які не бачыць падстаў для адназначна адмоўнай ацэнкі заходнерусізму [9, с. 403—404]. Тут неабходна хіба што дадаць: беларускія адраджэнцы ставіліся да заходнерусісцкай спадчыны досыць прагматычна, выбіраючы з яе толькі тое, што адпавядала інтарэсам нацыянальнага будаўніцтва. Да «палітычнага» ж заходнерусізму пачатку ХХ ст. яны ставіліся адмоўна.

Калі называць імя гісторыка з адпаведнай акадэмічнай адукацыяй, які ў найбольшай ступені паўплываў на фарміраванне нацыянальнай гістарыяграфіі, то, на наш погляд, гэта выхаванец кіеўскай навукова-гістарычнай школы М. В. Доўнар-Запольскі. Калі характарызаваць яго адносіны да заходнерусізму, то, вобразна кажучы, ён быў не супраць гэтага кірунку, а быццам бы ў баку ад яго. Ва ўсялякім разе, Д. У. Караў упэўнена далучае М. В. Доўнар-Запольскага да тых гісторыкаў, якія персаніфікавалі сабою ліберальны і дэмакратычны кірункі ў беларускай гістарыяграфіі, якая толькі нараджалася [7, с. 219—230] (пры ўсёй умоўнасці падзелу на гісторыкаў-ліberalаў і гісторыкаў-дэмакратаў, паколькі паміж гэтымі кірункамі, на нашу думку, існаваў своеасаблівы ідэйна-метадалагічны кантынуум).

Мабыць, не наша задача асвятляць у дадзеным артыкуле ўсе бакі багатай творчай спадчыны М. В. Доўнар-Запольскага. Усё ж неабходна адзначыць, што гісторык не сумняваўся ў гістарычнай суб’ектнасці беларускага народа. Больш за тое, менавіта М. В. Доўнар-Запольскі, па меркаванні І. А. Марзалюка, стаўся фактычна пачынальнікам канцэпцыі беларускага аўтахтанізму [4, с. 37—39]. З дадзенага пастулату па-свойму лагічна вынікаў тэзіс аб праве беларусаў, старажытных насельнікаў гэтай зямлі, самім вырашаць свой лёс, у тым ліку палітычнымі сродкамі, шляхам стварэння ўласнай дзяржавы. І сапраўды, гісторык не застаўся ў баку ад працэсу станаўлення беларускай дзяржаўнасці. У каламутным віры бурлівых падзей 1917—1922 гг. (ад Лютаўскай рэвалюцыі ў Расіі да ўтварэння СССР) знайшлося месца для выдання яго брашуры «Асновы дзяржаўнасьці Беларусі», якая пабачыла свет у 1919 г. [10]. Выданне гэтае мела мэтаю пераканаць перш за ўсё еўрапейскую грамадскасць у неабходнасці рэалізацыі неад’емнага права народа Беларусі на палітычнае самавызначэнне і стварэнне ўласнай дзяржавы. Нездарма ж яно было адрасаванае ўдзельнікам Версальскай мірнай канферэнцыі [7, с. 250].

У дадзенай брашуры М. В. Доўнар-Запольскі ў сціслай, амаль лозунгавай форме выклаў свае навукова-гістарычныя ідэі. З яго экскурсу ў мінулае вынікалі права беларусаў і неабходнасць далучыцца да палітычнай сям’і народаў Еўропы. Іншая справа, што гэты заклік быў праігнараваны ўдзельнікамі канферэнцыі. Аднак сама спроба сцвердзіць такім чынам беларускую дзяржаўнасць заслугоўвае ўвагі. Яна сведчыць пра тое, што дзеячы беларускага нацыянальнага руху пачалі разумець неабходнасць звароту да мінулага як адной з асноў беларускай дзяржаўнасці.

Пэўнай праблемай беларускай гістарыяграфіі, якая толькі што нарадзілася, да пары да часу была адарванасць яе ад шырокіх пластоў грамадства, якім адрасавалася нацыянальная агітацыя. Першым, хто на беларускай мове выклаў уласныя гістарычныя погляды ў навукова-папулярнай форме, быў вядомы беларускі палітык В. Ю. Ластоўскі. Гаворка, безумоўна, ідзе пра яго «Кароткую гісторыю Беларусі» [11]. У кантэксце, што нас цікавіць, важна падкрэсліць менавіта імкненне аўтара не толькі данесці да народа гістарычныя веды, хаця б на элементарным узроўні, але і паступовае выспяванне разумення актуальнай неабходнасці забяспечыць беларускі нацыянальны рух аргументацыяй навукова-гістарычнага характару.

Рэпазіторый БарДУ

Гэтае разуменне літаральна выпінаецца фактычна з першых радкоў твора: «Гісторыя — гэта фундамент, на каторым будуецца жыццё народа. І нам, каб адбудаваць сваё жыццё, трэба пачынаць з фундаменту, каб будынак быў моцны. А фундамент у нас важны, гісторыя наша багата: “жатва многа, а делатель мало”, як кажа Святое Пісанне. Поле пустое, бо сыны Бацькаўшчыны нашай к чужым у найміты пайшлі, чужыя гумны і засекі багацяць» [11, с. 5] *(тут і ніжэй у тэксце цытаты пададзеныя ў адпаведнасці з нормамі сучаснага акадэмічнага беларускага правапісу — **А. Л.**)*. Выбачаемся перад чытачом за такое адносна працяглае цытаванне, але надта ўжо ёмістая ў гэтым выпадку думка В. Ю. Ластоўскага. Па сутнасці, тут маецца абгрунтаванне грамадска-палітычнай і нацыянальна-культурнай важнасці гістарычных ведаў, няхай і выкладзенае досыць банальна.

Твор гэты мае характар навуковай кампіляцыі, гэткага «гіперрэферату», калі можна так выказацца. Разумеў дадзеную акалічнасць і сам аўтар, у чым не саромеўся прызнацца перад чытачамі [11, с. 5]. Аднак як своеасаблівы канспект па гісторыі, дадзены твор якраз быў прыдатны для гістарычнай адукацыі народа (зразумела, з улікам тых даволі абмежаваных магчымасцей, якімі валодалі беларускія адраджэнцы).

Гэтаксама В. Ю. Ластоўскі разумеў і мабілізацыйнае значэнне гістарычных ведаў. Нездарма ж асноўны тэкст працы аздоблены заключнай думкай наступнага зместу: «Васьмімільённы беларускі народ прачнецца з векавечнага сну і сам пойдзе за культурнай дабычай, сам збудуе сабе лепшую долю і не як загнаны пасынак, але як родны і роўны брат засядзе калісь у сям’і славянскай» [11, с. 103]. І хаця з кантэксту вынікае, што размова тут вядзецца пра выданне «Нашай нівы», наўрад ці будзе занадта смелым меркаваць, што гэтую веру падзяляў аўтар і яна, уласна кажучы, натхніла яго на стварэнне «Кароткай гісторыі Беларусі».

Такім чынам, пярэдадзень беларускай дзяржаўнасці маладая беларуская гістарыяграфія сустрэла не з пустымі рукамі. Яе намаганнямі Беларусь з зямлі паміж Расіяй і Польшчай, на якую прэтэндавалі азначаныя тут бакі, не пытаючыся думкі беларусаў, паступова ператваралася у самастойны аб’ект вывучэння метадамі гістарычнай навукі, а ад вылучэння яе ў аб’ект гісторыі паступова пралегла адна з дарог да палітычнай суб’ектнасці. Праўда, і перабольшваць значэнне гэтага фактару ў працэсе станаўленя беларускай дзяржаўнасці не даводзіцца. Сапраўды, наіўна было б спадзявацца, што лідары дзяржаў Антанты, азнаёміўшыся са згаданай вышэй брашурай М. В. Доўнар-Запольскага [10], выдадзенай на шасці мовах, раптам расчуляцца і прызнаюць-такі права беларусаў на самавызначэнне і на стварэнне ўласнай дзяржавы. Рэчаіснасць, як вядома, сталася значна больш жорсткай і трагічнай. Як здзек над лепшымі памкненнямі барацьбітоў за дзяржаўнасць Беларусі выглядае Рыжская мірная дамова 18 сакавіка 1921 г. паміж ужо Савецкай Расіяй і адроджанай Польшчай. Можна тут бачыць праяву адноснай слабасці беларускага руху. Але вось жа ўкраінскі нацыянальны рух быў прыкметна мацнейшым за беларускі (як, дарэчы, і мацнейшай за беларускую была украінская гістарыяграфія [7, с. 253—257]), аднак і Украіна была падзелена.

І ўсё ж намаганні беларускіх гісторыкаў давалі плён, няхай сабе і апасродкавана. Пастуляванне этнаграфічнага адзінства беларускага народа і адзінага гістарычнага лёсу, якое праходзіць праз творы М. В. Доўнар-Запольскага [10; 12] (апошняя праца не была выдадзена пры жыцці гісторыка, аднак яе змест вынікаў з яго папярэдніх, апублікаваных і вядомых дасведчанаму чытачу прац), В. Ю. Ластоўскага [11], У. М. Ігнатоўскага [13] (гэтая праца выкарыстоўвалася фактычна ў якасці падручніка ў спрыяльныя гады беларусізацыі), І. Абдзіраловіча [14] паступова рабілася фактам грамадскай свядомасці, з якім трэба было лічыцца нават тым, хто не адчуваў аніякіх сантыментаў да Беларусі, імкнучыся яе выкарыстоўваць як поле для геапалітычных гульняў. Без такога пастулявання і стварэння гістарычнага вобразу Беларусі бадай што былі б немагчымымі ўзбуйненні БССР у 1924 і 1926 гг. (ва ўсялякім разе, малаверагоднымі). І мы павінны быць удзячнымі першым беларускім гісторыкам, якія, няхай сабе памыляючыся, часам спрашчаючы у сваіх работах рэчаіснасць мінуўшчыны, тым не менш уносілі важкі ўклад у працэс станаўлення беларускай дзяржаўнасці, фарміруючы нацыянальна-гістарычную самасвядомасць.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Литвинский, А. В.* Историческое самосознание современных белорусов: варианты ценностной ориентации / А. В. Литвинский // Социальная синергетика и актуальная наука. Россия в глобальном мире: вызовы и перспективы развития : Междунар. сб. науч. тр. / под общ. ред. д-ра филос. наук, проф. В. П. Шалаева. — Йошкар-Ола : Мар. гос. техн. ун-т, 2011. — С. 298—306.

2. *Літвінскі, А. У.* Працэс трансфармацыі нацыянальна-гістарычнай самасвядомасці беларусаў у канцы XX — пачатку XXI стагоддзя / А. У. Літвінскі // Трансформационные процессы в белорусском обществе в Новейшее время. Дню независимости Республики Беларусь посвящается : материалы Респ. науч.-практ. конф., 18 апр. 2014 г., г. Барановичи, Респ. Беларусь / редкол.: А. В. Никишова (гл. ред.), А. В. Демидович (отв. ред.) [и др.]. — Барановичи : РИО БарГУ, 2014. — С. 13—18.

3. *Літвінскі, А. У.* Заходнерусізм як фактар гістарычнай самасвядомасці беларусаў / А. У. Літвінскі // Специалист XXI века : материалы III Междунар. науч.-практ. конф., посвященной 10-летию со дня образования ун-та, 4—5 июня 2014 г., г. Барановичи, Респ. Беларусь : в 2 кн. / редкол.: А. В. Никишова (гл. ред.), А. А. Селезнёв (отв. ред.) [и др.]. — Барановичи : РИО БарГУ. — Кн. 1. — С. 22—26.

4. *Марзалюк, І. А.* Міфы «адраджэнскай» гістарыяграфіі Беларусі : манаграфія / І. А. Марзалюк. — Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2009. — 148 с.

5. *Цвікевіч, А.* «Западноруссизм»: нарысы з гісторыі і грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. / А. Цвікевіч. — Мінск : Навука і тэхніка, 1993. — 347 с.

6. *Акудовіч, В. В.* Код адсутнасці (асновы беларускай ментальнасці) / В. В. Акудовіч. — Мінск : Логвінаў, 2007. — 216 с.

7. *Карев, Д. В.* Белорусская и украинская историография конца XVIII — начала 20-х гг. XX в. в процессе генезиса и развития национального исторического сознания белорусов и украинцев / Д. В. Карев. — Вильнюс : ЕГУ, 2007. — 312 с.




Репозиторий БарГУ

8. *Латышонак, А.* Гісторыя Беларусі ад сярэдзіны XVIII ст. да пачатку XXI ст. / А. Латышонак, Я. Мірановіч. — Вільня : Ін-т беларусістыкі ; Беласток : Беларус. гіст. т-ва, 2010. — 368 с.
9. *Латышонак, А.* Нацыянальнасць — беларус / А. Латышонак. — Вільня : Ін-т беларусістыкі ; Беласток : Беларус. гіст. т-ва, 2009. — 558 с.
10. *Доўнар-Запольскі, М. В.* Асновы дзяржаўнасьці Беларусі / М. В. Доўнар-Запольскі. — Мінск : ВПП Дзяржэканомплана Рэсп. Беларусь, 1994. — 23 с.
11. *Ластоўскі, В. Ю.* Кароткая гісторыя Беларусі / В. Ю. Ластоўскі. — Мінск : Універсітэцкае, 1993. — 126 с. : іл.
12. *Доўнар-Запольскі, М. В.* Гісторыя Беларусі / М. В. Доўнар-Запольскі. — Мінск : Бел. Энцыкл., 1994. — 510 с.: 1 л.
13. *Ігнатоўскі, У. М.* Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У. М. Ігнатоўскі ; 5-е выд. — Мінск : Беларусь, 1991. — 190 с., [12] л.: іл.
14. *Абдзіраловіч, І.* Адвечным шляхам: дасьледзіны беларускага сьветагляду / І. Абдзіраловіч. — Мінск : Навука і тэхніка, 1993. — 44 с.

УДК 159.947.5

**О. Е. Мальцева**
*Учреждение образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы», Гродно*

# ИЗМЕНЕНИЕ ЦЕННОСТЕЙ СОВРЕМЕННОЙ МОЛОДЁЖИ В РАЗЛИЧНЫЕ ПЕРИОДЫ ОБУЧЕНИЯ

Беларусь, как и все мировое сообщество, вступила в эпоху постиндустриальной цивилизации, одним из признаков которой является высокий темп развития информационных технологий и становление в стране информационного общества. Происходящий постоянный рост научно-технической информации, компьютеризация и автоматизация производства, внедрение новых технологий способствуют возникновению жесткой конкуренции на рынке труда, повышают уровень требований к профессиональной подготовке, переподготовке и повышению квалификации специалистов. Современному молодому специалисту необходимо не только осваивать рынок труда, закрепляться в нем, но и быть мобильным, конкурентоспособным, готовым к профессиональной деятельности и ответственным за ее результаты. Для него также необходимо четкое представление о своём профессиональном пути. В этой связи ведущей целью образования в новых экономических условиях Республики Беларусь должно стать целостное развитие человека как личности на протяжении всей его жизни, повышение возможностей его трудовой и социальной адаптации в быстро меняющемся мире, развитие его способностей, стремлений и возможностей. В контексте современной социально-экономической ситуации актуальными для нашего общества становятся психологические проблемы, связанные с процессом профессионального становления личности.

Многие психологи, придерживаясь разных направлений исследования, при раскрытии ядерной составляющей структуры личности, всегда ссылались на ценности, разделяемые людьми, поскольку ценностные ориентации выступают содержательной стороной, подсистемой, компонентом направленности личности [1]. Так, Б. Г. Ананьев отмечал, что «психологическое исследование мотивации поведения личности невозможно без социолого-философского (аксиологического) и социально-психологического изучения самих ценностей...» [2, с. 146]. С точки зрения Г. М. Андреевой, ценности представляют собой одновременно мотивационные и когнитивные образования. Они направляют, организуют, ориентируют поведение человека на определенные цели и в то же время детерминируют когнитивную работу с информацией [3]. Кроме того, ценности выступают как образования мотивационно-потребностной сферы и регулируют социальное поведение людей. Они представляют собой некоторые конечные (идеальные) цели, к которым стремится индивид, дают возможность принять решение в ситуации выбора, активизируют и направляют поведение и деятельность человека, в этой ипостаси ценности реализуются в ценностных ориентациях, определяя элемент диспозиционной структуры личности. Иначе говоря, ценностные ориентации осуществляют психическую регуляцию социальной деятельности и поведения субъекта в социальной среде [4]. По мнению М. С. Яницкого, система ценностных ориентаций определяет жизненную перспективу, «вектор» развития личности [5].

Стоит отметить, что в социальных, психологических и педагогических исследованиях (Б. Г. Ананьев, М. И. Бобнева, А. Г. Здравомыслов, О. И. Зотова, Г. Е. Залесский, Б. С. Круглов, Е. В. Шорохова, В. А. Ядов и др.) используются как понятие «ценности», так и понятие «ценностные ориентации». Под ценностными ориентациями понимается отражение в сознании человека ценностей, признаваемых им в качестве стратегических жизненных целей и общих мировоззренческих ориентиров [6]. Ценностные ориентации — это интериоризированные личностью ценности социальных групп. Таким образом, оказывается вполне оправданным говорить о ценностях личности как ее ценностных ориентациях [7]. Содержание ценностных ориентаций личности обусловлено характером общественных отношений [8] и в значительной степени взаимосвязано с процессом обучения и воспитания.

Таким образом, в целях совершенствования системы профессионального образования процесс подготовки специалистов необходимо строить с учетом ценностей и мотивов обучающихся, поскольку

© Мальцева О. Е., 2018

Репозиторий БарГУ